# „Маладняк“.

*(Замест дэклярацыі).*

„Маладняк“ — гэта ўсебеларускае аб‘яднаньне поэтаў і пісьменьнікаў, якія згуртаваліся дзеля таго, каб ідэі матар‘ялізму, марксызму і ленінізму ажыцьцёвіць у беларускай мастацкай творчасьці.

Мы зарунелі на беларускіх загонах, узораных плугам Кастрычнікавай рэволюцыі. Расьцем мы ў пару пераходную да комунізму—пару дыктатуры пролетарыяту. Гэта пара вызначаецца сваёй асабістай культураю, якая складаецца са спадчыны культурных дасягненьняў папярэдніх вякоў і новых галін будучай культуры, культуры комуністычнага ладу грамадзтва. Мы—маладняк гэтых новых усходаў і разрастаемся на загонах беларускай мастацкай творчасьці, выціскаючы ўвесь чэмер і палын, што аддае затхласьцю мінулага.

Наша заданьне — з асноў сягоньнешняга жыцьця вылучыць асновы заўтрашняга і апрануць іх у вопратку мастацкай творчасьці, штодзенны вопыт рабочых і сялян—будаўнікоў новага сьвету—ажыцьцёвіць у мастацкіх праўдзівых вобразах. Мы—маладняк новага зьместу мастацкай творчасьці.

Шлях дасягненьня вызначаных мэтаў—шлях колектыўны. Колектыўная праца—вось рухаўнік нашага сёньнешняга росту. Індывідуальны вопыт у рамках колектыўнай працы,—вось зьмест нашага росту. Выкоўваньне новых форм мастацкай творчасьці, адпавядаючых новаму зьместу,—гэта наш вопыт.

Асноваю нашай мастацкай формы, у якой мы ажыцьцяўляем нашы ідэі, зьяўляецца мастацка-праўдзівы вобраз, об‘ектыўна адпавядаючы рэальнасьці. На розныя сучасныя мастацка-формальныя напрамкі ў літаратуры мы глядзім, як на тэхніку мастацкай творчасьці. Наш асноўны прынцып: форма павінна адпавядаць зьместу, выкладаньне—тэме. Мы—маладняк і формальнай стараны мастацкай творчасьці.

**Усебеларускае аб‘яднаньне поэтаў**
**і пісьменьнікаў „Маладняк“.**